Беларусь.info

№90 10/06/2006

*Найдакладнейшае вымярэнне каштоўнасці чалавека — не тое, што ён робіць у час спакою і ўтульнасці, а тое, як ён трымаецца падчас барацьбы і супярэчнасцяў.*

**Марцін Лютэр Кінг**

Грамадская пазапалітычная і пазацэнзурная ініцыятыва. Распаўсюджваецца бясплатна

# Падзеі

**У Брэсце працягваецца галадоўка пяці індывідуальных прадпрымальнікаў.** Тых самых, што патрапілі пад прэзідэнцкі ўказ аб павелічэнні пошлінаў на аўтамабілі, якія выкарыстоўваюцца ў камерцыйных мэтах. Яны прайшлі ўсе судовыя інстанцыі, спрабуючы аспрэчыць шматмільённыя штрафы і даказваючы, што падобны закон не па якіх юрыдычных нормах зваротнай сілы мець не можа. Усё аказалася безвынікова — беларускія суды не адважыліся паправіць Лукашэнку.

**Экс-суддзя Канстытуцыйнага суду стаў на бок абароны Казуліна.** Паводле меркавання Міхаіла Пастухова, супрацьпраўных дзеянняў Аляксандр Казулін не здзяйсняў. У той жа час ён лічыць, што працэс над апазіцыйным палітыкам паказвае: у краіне адбываецца прававое бязмежжа.

**Віцебскі апазіцыянер Барыс Хамайда, затрыманы перад прыездам у абласны цэнтр Аляксандра Лукашэнкі, правёў двое сутак у ізалятары часовага утрымання.** Ён быў затрыманы 7 ліпеня падчас распаўсюджвання незалежных выданняў. Месца, дзе традыцыйна знаходзіцца апазіцыянер, размешчанае насупраць Летняга амфітэатра. Затрыманне адбылося за некалькі гадзінаў да цырымоніі адкрыцця Віцебскай гарадской клінічнай лякарні хуткай медыцынскай дапамогі, у якой удзельнічаў прэзідэнт Беларусі.

# Факты

**У камітэт абароны рэпрэсаваных звярнуліся каля 370 студэнтаў.** У грамадскі камітэт абароны рэпрэсаваных звярнуліся ўжо каля 370 студэнтаў, выключаных з беларускіх ВНУ за палітычную дзейнасць або тых, хто знаходзіцца пад пагрозай выключэння. Паводле яе словаў, амаль кожны трэці — яшчэ не адлічаны з ВНУ, але адчувае ціск з боку дэканатаў: іх адпраўляюць на пераздачы і зацягваюць тэрміны сесіі.

# Цытаты

**Аляксандр Мілінкевіч зьвярнуўся да кіраўнікоў краінаў G8.** Сёньня лідэр аб’яднанай беларускай апазыцыі Аляксандар Мілінкевіч праз дыпляматычныя місіі накіраваў ліст да прэзыдэнтаў краінаў, якія зьбяруцца ў Расеі на саміт “вялікай васьмёркі”. “Усё больш інфармацыі, якая паступае з розных крыніцаў, сьведчыць пра магчымасьць правядзеньня ў найбліжэйшыя месяцы рэфэрэндуму ў рамках праекту саюзнай дзяржавы Расеі й Беларусі. Ня выключана, што верагодны рэфэрэндум закране пытаньні ўвядзеньня расейскага рубля на тэрыторыі Беларусі альбо прыняцьця канстытуцыйнага акту саюзнай дзяржавы”.

# Абвесткі

**Новы конкурс – "Фота Свабоды"**. "Фота Свабоды" – Ваш погляд на беларускае жыццё. Дасылайце (з кароткім апісаннем – што, дзе, калі) здымкі падзеяў, сітуацыяў, людзей на адрас svaboda@rferl.org з пазнакай "fota Svabody". Падрабязнасці на www.svaboda.org